УДК 947.2:323.311

**А. А. Дамарад**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ПАШЫРЭННЕ ПРАВОЎ І ПРЫВІЛЕЯЎ ШЛЯХТЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XVI СТ.

Артыкул прысвечаны актуальнаму пытанню гісторыі шляхецкага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI ст., калі ўзаемная запатрабаванасць дзяржавы і феадалаў дасягнула максімума. Феадальная сістэма, што існавала ва ўсёй Еўропе, усталявала спецыфічныя адносіны паміж дваранствам і манархіяй, вядомыя як васалітэт. Гэтыя адносіны грунтаваліся на ваеннай службе, якая была адзінай крыніцай абароны дзяржавы. Узаемныя інтарэсы дзяржавы і феадалаў прывялі да паступовага пашырэння ў апошніх спецыфічнага кола правоў, што вынікалі з патрэбы дзяржавы ў лаяльнай ваеннай сіле. У Вялікім княстве Літоўскім манархічная ўлада вымушана была дастаткова моцна пашыраць палітычныя і эканамічныя правы нетытулаванай шляхты па прычыне спецыфічнасці парадку наследавання вялікакняжацкай улады, неабходнасці захавання дынастычнай уніі з Польшчай, а таксама цяжкага знешнепалітычнага становішча. Прыкладам у гэтым працэсе былі асобныя дасягненні шляхты Польшчы. У XVI ст. правы і прывілеі шляхты замацоўваліся ў дзяржаўных дакументах, перш за ўсё Статуце, і датычыліся пашырэння палітычных паўнамоцтваў, выбарных судоў, рэлігійных пытанняў, прадстаўнічых органаў. З гэтага часу шляхта ўяўляла сабой саслоўе, усе групы якога заканадаўча былі роўныя, што безумоўна спрыяла яе кансалідацыі і канчатковаму афармленню.

**Ключавыя словы:** манархія, шляхта, закон, палітычныя правы, маёмасць, суд.

**Для цытавання:** Дамарад А. А. Пашырэнне правоў і прывілеяў шляхты Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст. // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2021. № 1 (245). С. 18–22.

**A. A. Damarad**
Belarusian State Technological University

# EXPANSION OF THE RIGHTS AND PRIVILEGES OF THE NOBILITY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE XVI CENTURY

The article is devoted to the actual question of the history of the gentry class in the Grand Duchy of Lithuania in the XVI century, when the mutual demand for the state and the feudal lords reached a maximum. The feudal system that existed throughout Europe established a specific relationship between the nobility and the monarchy, known as vassalage. This relationship was based on military service, which was the only source of protection for the State. The mutual interests of the state and the feudal lords led to the gradual expansion of the specific range of rights in the latter, which resulted from the state's need for a loyal military force. In the Grand Duchy of Lithuania, the monarchical power was forced to significantly expand the political and economic rights of the untitled nobility due to the specificity of the order of succession to the grand ducal power, the need to preserve the dynastic union with Poland, as well as the difficult foreign policy situation. An example in this process was the individual achievements of the Polish gentry. In the XVI century, the rights and privileges of the gentry were enshrined in state documents, primarily the Charter, and related to the expansion of political powers, elected courts, religious issues, and representative bodies. From now on, the gentry was a class, all groups of which were legally equal, which certainly contributed to its consolidation and final registration.

**Key words:** Monarchy, nobility, law, political rights, property, court.

**For citation:** Damarad A. A. Expansion of the rights and privileges of the nobility of the Grand Duchy of Lithuania in the XVI century. *Proceedeings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2021, no. 1 (245), pp. 18–22 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Пашырэнне палітычных і маёмасных правоў шляхты Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст. значна паскорылася.

Эвалюцыйны перыяд афармлення правоў шляхецкага саслоўя Вялікага княства Літоўскага з канца XIV ст. паступова паскараецца і набывае сістэмны характар. Пашырэнне правоў шляхты праходзіла ў цеснай сувязі з міждзяржаўнымі ўніямі Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага. Працэс заканадаўчага афармлення феадалізму заняў працяглы час, але менавіта на XVI ст. прыходзяцца важныя рашэнні па замацаванні за шляхтай палітычных і грамадскіх правоў.

Шляхта з’яўлялася пануючым станам у Вялікім княстве Літоўскім, але па сваім складзе

была неаднародная як па заможнасці, так і па паходжанні. Першапачаткова асноўную масу феадалаў складалі нашчадкі старажытнарускіх князёў, баяр, дружыннікаў. У XIV ст., пасля атрымання зямельных уладанняў, да іх далучыліся літоўскія нобілі і дружыннікі. Асноўная ж маса феадалаў, якія з'яўляліся сярэднімі і невялікімі землеўласнікамі, называлася у XIV– пачатку XVI ст. баярамі. Пачынаючы з прывілея 1413 г. побач з тэрмінам «баяры» ўсё часцей ужываецца тэрмін «шляхта» ці «баяры-шляхта».

Усе ўладальнікі маёнткаў павінны былі несці ваенную службу. Гэтую павіннасць феадалы выконвалі асабіста і разам са сваімі ваеннымі слугамі, таксама феадаламі, што знаходзіліся на службе ў сваіх сеньёраў і атрымлівалі ад іх землі. Земская ваенная служба была абавязковай для ўсіх феадалаў, землеўласнікаў паводле земскага права.

На самай нізкай прыступцы шляхецкага саслоўя знаходзіліся дробныя баяры-шляхта, якія мелі невялікія надзелы зямлі. Частка іх знаходзілася ў васальных адносінах з князямі, панамі.

**Асноўная частка.** З першай паловы XVI ст. пачынаецца новы этап у саслоўнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага. Адносна землеўласнікаў можна прасачыць дзве тэндэнцыі: далейшае пашырэнне правоў шляхты і паступовая яе нівеліроўка.

У дадзены перыяд рэальнае становішча шляхты ў Вялікім княстве Літоўскім было непадобнае да сітуацыі, што склалася ў Польшчы. На землях Вялікага княства сацыяльнае і эканамічнае жыццё кантралявала невялікае кола асоб, якія валодалі вялікімі маёнткамі-латыфундыямі і трымалі ў сваіх руках галоўныя дзяржаўныя пасады. Асноўная ж маса шляхты была адхілена ад удзелу ў дзяржаўным жыцці. Інакш было ў суседняй Польшчы, дзе раней шляхта дамаглася пэўнай дэмакратызацыі дзяржаўнага ладу і ўмацавала свае пазіцыі. Ужо на Мельніцкім сойме 1501 г. была абмежавана судовая ўлада караля, яго права прызначацьураднікаў. З паслоў шляхецкіх соймікаў утварылася пасольская палата кароннага сойма. У 1505 г. канстытуцыя Nihil novi пастанавіла, што згода паслоў шляхты стала абавязковай ўмовай ухвалення новых пастаноў. Сойм 1504 г. забараніў раздаваць панам ва ўладанне дзяржаўныя землі. У 20-х гг. XVI ст. польская шляхта пачынае так званы экзекуцыйны рух, што ставіў на мэце поўную рэалізацыю на справе прынятых пастаноў [1, с. 422]. Сярод галоўных задач было ўраўнанне правоў і абавязкаў заможных родаў з усім рыцарствам, адміністрацыйная, судовая, вайсковая рэформы і г. д.

Дасягненні кароннага рыцарства сталі добрым прыкладам для шляхты ВКЛ. Атрымаўшы ў пачатку XVI ст. доступ да сойма, яна ўсё больш настойліва пачынае дабівацца пашы-рэння сваіх правоў. Ужо ў 1514 і 1522 гг. вялікі князь атрымлівае прапановы аб тым, каб падданыя Вялікага княства Літоўскага атрымалі пісанае права і законы. Падтрымаўшы гэтую ідэю, манарх і паны-рада ствараюць камісію на чале з канцлерам ВКЛ Гаштольдам А., якая распрацоўвае праект будучага Статута. Гэты праект абмяркоўваўся паартыкульна на Вялікім Вальным сойме, пакуль не быў прыняты ўсімі дэлегатамі. Статут павінен быў не толькі замацаваць кадыфікацыю законаў, але і дапоўніць прабелы ў заканадаўстве.

Спецыяльным прывілеем 29 верасня 1529 г. першы Статут ВКЛ быў уведзены ў дзеянне. Статут 1529 г. грунтаваўся ў асноўным на звычаёвым праве, аднак, выкарыстоўваючы вопыт іншых краін, змясціў шмат новых норм розных галін права [2, с. 25]. З гэтага часу пачынаецца новы этап у развіцці права Вялікага княства Літоўскага ў цэлым і шляхецкіх правоў у прыватнасці. Таму толькі часткова можна пагадзіцца з М. Ясінскім, што калі Статут 1529 г. сваім з'яўленнем паклаў канец «тому беспорядку, который царил раньше в ВКЛ вследствие действия множества разнообразных законов –то отсюда еще не следует, что появление Статута положило предел силе и значению уставных грамот, уничтожило всякий смысл их бытия» [3, с. 97]. Сапраўды, агульназемскія прывілеі выдаваліся вялікімі князямі і пазней (у 1547, 1563, 1568 гг.), аднак яны ў асноўным паўтаралі ранейшыя палажэнні. Значэнне Статута ў тым, што ў ім былі аб'яднаны ўсе ранейшыя правы шляхты, якая арт. 10 раздзела III была пастаўлена на вызначальнае месца у дзяржаве.

Значная ўвага ў Статуце 1529 г. надавалася правам шляхецкага саслоўя. Найперш вялікі князь абавязваўся і далей захоўваць у цэласці шляхецкія вольнасці (Р. III, арт. 7). Замацоўваліся і маёмасныя правы землеўласнікаў. Але да вырашэння важнейшых дзяржаўных праблем былі дапушчаны толькі найбольш знакамітыя заможныя прадстаўнікі саслоўя ў складзе паноў-рады. Акрамя таго, шляхта не атрымала свайго незалежнага суда, таму Статутам 1529 г. землеўласнікі задаволіліся не ў поўнай ступені.

У наступныя гады на соймах усё часцей гучалі патрабаванні аб далейшым пашырэнні правоў шляхты. Улада Вялікага княства Літоўскага пакуль не задавальняе такіх просьбаў. Адначасова пачынаюць з'яўляцца патрабаванні з боку сойма аб «папраўе статута», што стала галоўнай мэтай шляхты на сойме. Яшчэ на Бельскім сойме 1544 г. была прынята пастанова

пра прызначэнне для гэтага спецыяльнай камісіі. Аднак вялікі князь не згадзіўся забяспечыць яе фінансаванне за ўласны кошт і таму на сойме ў Вільні у 1547 г. прапанаваў яго ўдзельнікам самім вызначыць склад камісіі і забяспечыць яе членаў грашыма са сваіх маёнткаў. У выніку справа аб функцыянаванні камісіі была вырашана толькі ў 1551 г. кампрамісам: вялікі князь і паны-рада прызначылі яе членаў, а шляхта аплаціла іх працу [1, с. 215].

Безумоўна, шляхта дабівалася выпраўлення Статута сыходзячы са сваіх карпаратыўных інтарэсаў. Разам з тым, не чакаючы зацвярджэння новай яе рэдакцыі, землеўласнікі вылучылі цэлы шэраг хадайніцтваў, якія былі накіраваны на пашырэнне палітычных, саслоўных і эканамічных прывілеяў. У прыватнасці, галоўным патрабаваннем на сойме 1547 г. стала пацвярджэнне ранейшых правоў і прывілеяў новым манархам Жыгімонтам Аўгустам. Апошні пагадзіўся з гэтым, загадаў паказаць і зачытаць перад дэлегатамі сойма ранейшыя агульназемскія прывілеі і абяцаў зацвердзіць іх сваім лістом. У выніку ў 1551 г. ён сапраўды выдаў такі дакумент [4, с. 58].

Вельмі важным было таксама пытанне аб выбарных земскіх судах. Нягледзячы на тое, што на Берасцейскім сойме вялікі князь адмовіўся задаволіць просьбу шляхты, у 1547 г. гэтая праблема зноў была ўзнята.

Сярод прычын, якія выклікалі незадаволенасць судовым ладам, трэба назваць перш за ўсё тое, што суд быў дарагім. Па сведчаннях сучасніка апісваемых падзей Міхалона Літвіна, калі справа вялася за невялікі надзел зямлі, то суддзя атрымлівае не дзесятую частку аспрэчваемай маёмасці, а 100 грошай, нават калі гэты надзел каштуе менш. Тлумачыць гэта аўтар трактата сквапнасцю суддзяў [5, с. 80]. Акрамя таго, паколькі судовыя функцыі выконвалі службовыя асобы, якія мелі іншыя абавязкі, справы разглядаліся вельмі марудна, не было пастаяннага месцазнаходжання суда. Да таго ж найбольш уплывовыя паны карысталіся пэўным прыярытэтам і ільготамі пры вырашэнні судовых спраў [6, с. 148]. Усё гэта незадавальняла асноўную частку шляхецтва.

З патрабаванняў шляхты можна зрабіць выснову, што нават парадак ажыцяўлення правасуддзя, устаноўлены Статутам 1529 г., не прыжыўся. Прадугледжвалася, што шляхту будуць судзіць ваяводы, старасты, маршалкі тых паветаў, дзе знаходзяцца шляхецкія маёнткі, ці намеснікі гэтыхураднікаў з абавязковымі прадстаўнікамі ад мясцовай шляхты. Але ўзнятае пытанне сойма 1547 г. сведчыць, што прадстаўнікі ад шляхты не прызначаліся, а суд вяршылі ваяводы, дзяржаўцы і іншыя асобы. Гэта прыводзіла да канцэнтрацыі судовай улады ў нешматлікай групы службовых асоб, што часта не дазваляла дабіцца справядлівасці без вялікіх грошай.

Былі і іншыя патрабаванні, якія вылучала шляхта на соймах у 1547, 1551, 1554 гг., але толькі нязначная іх колькасць была задаволена да пачатку Лівонскай вайны 1558–1583 гг. Працяглая і напружаная вайна вычарпала ўсе рэсурсы гаспадарскага скарба і прымусіла яго звяртацца за матэрыяльнай падтрымкай да землеўласнікаў Вялікага княства Літоўскага. Таму ў адносінах да саслоўных і палітычных памкненняў шляхты ўлада становіцца больш лаяльнай.

У сваім сцверджанні, што вайна паскорыла ажыццяўленне рэформаў на карысць шляхты, М. К. Любаўскі мае рацыю [7, с. 276]. Дзякуючы таму, што да сярэдзіны XVI ст. шляхта кансалідавалася ў адзінае саслоўе, больш адцягваць задавальненне яе патрэбаў вярхоўная ўлада не магла. Да гэтага часу была выпрацавана цэлая праграма, выканання якой шляхта дабівалася на соймах. Яна жадала вызвалення ад усіх, у тым ліку і ўскосных падаткаў, ураўнання ў правах з зямельнай арыстакратыяй, стварэння выбарнага суда, якому былі б падсудныя землеўладальнікі без усялякіх выключэнняў.

Ужо на сойме 1559 г., калі вырашалася пытанне пра прыняцце Лівоніі пад абарону Вялікага княства Літоўскага, была задаволена адна з гэтых просьбаў. Вялікі князь вызваліў ад мытных плацяжоў лясныя тавары, збожжа і жывёлу, якія будуць вывозіцца са шляхецкіх маёнткаў за мяжу. У далейшым Статут 1566 г. пацвердзіў гэтае права і нават пашырыў яго ў тым сэнсе, што вызваліў прадукты шляхецкіх гаспадарак ад мыта на ўнутраных мытнях, а вазы з асабістымі рэчамі – ад уплаты «мастовага» (Р. I, арт. 26).

Вельмі важным для землеўладальнікаў было і рэлігійнае пытанне. Вядома, што з XV ст. правы праваслаўных феадалаў абмяжоўваліся ў агульназемскіх прывілеях. Нягледзячы на тое, што ў большасці гэтых устанаўленняў не прытрымліваліся, існавала пэўная традыцыя прыніжэння некатолікаў, якая захавалася і ў XVI ст. (прывілеі 1547, 1551 гг.). Відаць, у адносінах да праваслаўных гэтая тэндэнцыя захоўвалася больш як стаўленне да «схізматыкаў маскавіцян» [8, с. 12], чым непасрэдна да самой шляхты ВКЛ. Аднак літаральна праз дванаццаць гадоў пасля 1551 г. стаўленне да гэтага пытання змяняецца. Калі раней літоўская арыстакратыя не хацела губляць свае пасады на карысць праваслаўных, то цяпер агульнай тэндэнцыяй стаў адыход ад каталіцтва ў пратэстантызм пад уплывам еўрапейскага Рэнесансу і пошук саюзу з праваслаўнымі ў барацьбе з рыма-каталіцкім уплывам. Акрамя таго, трэба

ўлічваць і факт далейшай кансалідацыі шляхты як саслоўя: агульныя інтарэсы адсунулі на другі план рэлігійныя праблемы. У выніку ў 1563 г. шляхта дамаглася фармальнай ліквідацыі тых абмежаванняў, якія накладаліся раней на некатолікаў. У спецыяльным прывілеі Жыгімонта Аўгуста ґаварылася пра стан рыцарскі ўвогуле, «одно бы были веры хрестианское», а наконт праваслаўных адзначаецца, што не толькі «Римского костела послушные, але и Грецкого», паказвалі сваю вернасць вялікім князям і дзяржаве [4, с. 55].

Асабліва настойліва ў першай палове 60-х гг. XVI ст. шляхта дабівалася стварэння выбарнага земскага суда, які б сваёй юрысдыкцыяй ахопліваў усіх землеўласнікаў, у тым ліку паноў і князёў. Неабходна адзначыць, што, акрамя прыкладу Польшчы, у Вялікім княстве Літоўскім такія суды існавалі ў заходнім Падляшшы (землях Дарагічанскай з сярэдзіны XV ст. і Бельскай з 1501 г.). Увогуле ж польскі прыклад паступова схіляў дробную шляхту да ўніі з Польшчай. Цяпер ужо ні манарх, ні магнаты не маглі супраціўляцца жаданню сойма мець новы Статут і свой выбарны земскі суд па польскім узоры. Цікавую аргументацыю дзеянняў вышэйназваных асоб прыводзіць М. К. Любаўскі. Паводле яго слоў, «король [падтрымаў шляхту – Д. А. А.], чтобы не лишиться союзника в деле установления унии с Польшею, а магнаты, чтобы не толкать еще более рыцарство-шляхту в объятия Польши и не заставлять ее искать новых прав и вольностей в подданстве новому государству» [1, с. 678].

Адсюль зразумела, чаму на Бельскім сойме 1564 г., калі стала вядома, што праект новага Статута падрыхтаваны, паны-рада і ўраднікі заявілі аб адмове ад сваёй судовай улады. Затым усе станы сойма абвясцілі, што ўсе яны без выключэння аб'ядноўваюцца ў адзінае роўнае права і ў адзіны суд. Са свайго боку вялікі князь пайшоў насустрач сойму і 1 ліпеня 1564 г. выдаў прывілей, якім зацвердзіў утварэнне выбарных шляхецкіх судоў, іх аддзяленне на месцах ад вялікакняскай адміністрацыі. Абвяшчалася роўнасць усіх землеўласнікаў перад законам, гарантавалася неўмяшанне адміністрацыі ў судовыя справы шляхты і абяцалася паскорыць выданне новай рэдакцыі Статута.

Тым не менш выпраўлены Статут не пачаў дзейнічаць так хутка, як абяцаў гэта вялікі князь. Першапачаткова неабходна было вызначыць парадак абрання новых суддзяў, выбраць іх, вызначыць межы судовых акруг і прызначыць месца захоўвання судовых кніг. Натуральна, што вырашыць такое кола пытанняў на Бельскім сойме было немагчыма. Таму было вырашана склікаць новы з'езд шляхты пазней, але паколькі ішлі баявыя дзеянні, сустрэча адбылася толькі ў наступным годзе ў Вільні.

Сойм 1565–1566 гг. увайшоў у гісторыю як рэфармацкі. Акрамя судовай, была праведзена тэрытарыяльна-адміністрацыйная рэформа і ўведзены ў дзеянне Статут 1566 г.

З гэтага часу персанал земскага суда, у якім разглядаліся грамадзянскія справы, складаўся з суддзі, падсудка і пісара. Кандыдатаў на гэтыя пасады абіралі на павятовых сойміках, а вялікі князь зацвярджаў аднаго з іх пажыццёва. Выбранымі маглі быць толькі народжаныя ў ВКЛ шляхцічы-хрысціяне. Справы ў земскім судзе разбіраліся пасесійна, тры разы ў год. Пад час судовых сесій у судовыя кнігі заносіліся ўсе прыватныя акты (тэстаменты, пераход права ўласнасці і г. д.) [6, с. 152].

Другім судом для шляхты стаў падкаморскі суд, створаны для разгляду зямельных спрэчак, якіх было вельмі шмат. Вырашэнне справы адбывалася на месцы межаў землеўладанняў, таму суд называлі «межавым» [9, с. 23]. Існаваў і пастаянна дзеючы гродскі суд па крымінальных злачынствах.

Не менш важным для дзяржавы ў цэлым стала павятовая рэформа. Звязана яна з увядзеннем мясцовых павятовых соймікаў, на якіх абмяркоўваліся пытанні, што выносіліся на вальны сойм, і з абраннем двух паслоў ад павета. Цяпер на вальны сойм не абавязкова было збірацца ўсёй шляхце, што было вельмі важна для абароназдольнасці Вялікага княства Літоўскага, паколькі не адрывала ваенна-служылае саслоўе ад удзелу ў вайне. Практыка прадстаўніцтва была вядома і да рэформ 1560-х гг. Напрыклад, у 1512 г., баючыся нападу ворага, на сойм выклікаліся дэпутаты ад памежных паветаў, па два ад кожнага, прычым выбар паслоў пакідаўся за мясцовай шляхтай [4, с. 41]. У некаторых выпадках абранне прадстаўнікоў адбывалась паводле жадання самой шляхты. Строга вызначанага парадку не існавала. Толькі ў паветах Падляшша (Бельскім, Дарагічынскім, Мельніцкім) прасочваецца тэндэнцыя выбару двух паслоў, а з 1547 г. – аднаго, паколькі павятовы харунжы выконваў ролю другога. Увогуле, паўсюднае ўвядзенне інстытута павятовых соймікаў дазволіла шляхце займацца мясцовымі справамі, не губляючы час і грошы на паездкі ў сталіцу.

**Заключэнне**. Такім чынам, стварэнне выбарных, незалежных ад дзяржаўнай адміністрацыі судоў, павятовая рэформа сведчылі не толькі пра новы этап у развіцці прававой культуры грамадства Вялікага княства Літоўскага, але і пра значнае павышэнне ролі ўсяго шляхецкага саслоўя ў дзяржаве на фоне вострай унутры- і знешнепалітычнай барацьбы. З гэтага часу шляхта ўяўляла сабой саслоўе, усе групы якога

заканадаўча былі роўныя, што безумоўна, спрыяла яе кансалідацыі і канчатковаму афармленню. Наступная ж эпоха развіцця сацыяльна-палітычных адносін праходзіла ўжо ў новай дзяржаве, створанай у тым ліку пад уплывам раскрытых памкненняў шляхты – Рэчы Паспалітай.

## Спіс літаратуры


1. Любавский М. К. Литовско-русский сейм. Опыт из истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства. М.: Об-во истории и древностей российских при Моск. ун-те, 1900. 850 с.
2. Доўнар Т. І. Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV–XVI стагоддзях. Мінск: Пропилеи, 2000. 224 с.
3. Ясинский М. Н. Уставные земские грамоты Литовско-Русского государства. Киев: Университетская тип., 1898. 210 с.
4. Акты, относящиеся к истории западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. В 5 т. Санкт-Петербург: Тип. Э. Праца, 1848. Т. 3. 368 с.
5. Литвин М. О нравах татар, литовцев и московитян. М.: Из-во МГУ, 1994. 151 с.
6. Довнар-Запольский М. В. История Белоруссии. Минск: Беларусь, 2003. 680 с.
7. Любавский М. К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. М.: Об-во истории и древностей российских, 1915. 401 с.
8. Любавский М. К. К вопросу об ограничении прав православных князей, панов и шляхты в Великом княжестве Литовском до Люблинской унии. М.: Об-во истории и древностей российских, 1909. 17 с.
9. Лаппо И. И. Земский суд в Великом княжестве Литовском в конце XVI века // Журнал Министерства Народного Просвещения. Седьмое десятилетие. Часть 311. 1897 г. Июнь. Санкт-Петербург: Тип. В. С. Балашева и К°, 1897.


## References


1. Lyubavskiy M. K. *Litovsko-russkiy seym. Opyt iz istorii uchrezhdeniya v svyazi s vnutrennim stroyem i vneshney zhizn'yu gosudarstva* [Lithuanian-Russian Sejm. Experience from the history of the institution in connection with the internal system and the external life of the state]. Moscow, Obschestvo istorii i drevnostey rossiyskikh pri Moskovskom universitete, 1900. 850 p.
2. Dounar T. I. *Razvitstse asnounykh instytutau gramadzyanskaga i kryminal'naga prava Belarusi u XV–XVI stagoddzyakh* [Development of the main institutions of civil and criminal law of Belarus in the XV–XVI centuries]. Minsk, Propilei Publ., 2000. 224 p.
3. Yasinskiy M. N. *Ustavnyye zemskiye gramoty Litovsko-Russkogo gosudarstva* [Statutory letters of the Lithuanian-Russian state]. Kiev, Universitetskaya tipografiya Publ., 1898. 210 p.
4. *Akty, otnosyashchiyesya k istorii zapadnoy Rossii, sobrannyye i izdannyye Arkheograficheskoy komissiyey* [Acts relating to the history of western Russia, collected and published by the Archaeographic Commission]. St. Petersburg, Tip. E. Pratsa Publ., 1848. Vol. 3. 368 p.
5. Litvin M. *O nravakh tatar, litovtsev i moskovityan* [About the customs of the Tatars, Lithuanians and Muscovites]. Moscow, MGU Publ., 1994. 151 p.
6. Dovnar-Zapol'skiy M. V. *Istoriya Belorussii* [History of Belarus]. Minsk, Belarus' Publ., 2003. 680 p.
7. Lyubavskiy M. K. *Ocherk istorii Litovsko-Russkogo gosudarstva do Lyublinskoy unii vkliyuchitel'no* [An outline of the history of the Lithuanian-Russian state before the Lublin Union]. Moscow, Obschestvo istorii i drevnostey rossiyskikh pri Moskovskom universitete Publ., 1915. 401 p.
8. Lyubavskiy M. K. *K voprosu ob ogranichenii prav pravoslavnykh knyazey, panov i shlyakhty v Velikom knyazhestve Litovskom do Lyublinskoy unii* [On the issue of limiting the rights of Orthodox princes, princes and gentry in the Grand Duchy of Lithuania to the Lublin Union]. Moscow, Obschestvo istorii i drevnostey rossiyskikh pri Moskovskom universitete Publ., 1909. 17 p.
9. Lappo I. I. Zemsky court in the Grand Duchy of Lithuania at the end of the 16th century. *Zhurnal Ministerstva Narodnogo Prosveshcheniya* [Journal of the Ministry of National Education]. St. Petersburg, Tip. V. S. Balasheva Publ., 1897 (In Russian).


## Інфармацыя пра аўтара


**Дамарад Аляксей Анатольевіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і палітологіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: domorad@belstu.by


## Information about the author


**Damarad Aliaksei Anatolievich** – PhD (History), Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: domorad@belstu.by


*Паступіў 15.02.2021*